# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## № 4(94) 2017

**СЕРЫЯ 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**

*Галоўны рэдактар* А. І. Жук

*Рэдакцыйная калегія:*

А. П. Жытко (нам. галоўнага рэдактара) (Рэспубліка Беларусь)
Т. М. Буйко (Рэспубліка Беларусь)
Л. М. Давыдзенка (Рэспубліка Беларусь)
А. В. Данільчанка (Рэспубліка Беларусь)
Г. У. Карзенка (Рэспубліка Беларусь)
І. В. Катляроў (Рэспубліка Беларусь)
В.Б. Келер (Федэратыўная Рэспубліка Германія)
В. В. Кірылаў (Расійская Федэрацыя)
А. Я. Кучко (Рэспубліка Беларусь)
А. С. Лапцёнак (Рэспубліка Беларусь)
А. М. Люты (Рэспубліка Беларусь)
У. Ф. Мартынаў (Рэспубліка Беларусь)
У. А. Мельнік (Рэспубліка Беларусь)
Я. Міранович (Рэспубліка Польшча)
Р. К. Мірзаханян (Рэспубліка Арменія)
А. І. Смолік (Рэспубліка Беларусь)
А. Г. Субоцін (Рэспубліка Беларусь)
А. Г. Шваб (Украіна)
А. М. Эскрыдж-Космач (Злучаныя Штаты Амерыкі)

*Адрас рэдакцыі:*
Вул. Магілёўская, 37, пакой 124,
220007, Мінск,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.by

Пасведчанне № 1355 ад 06.05.10.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 20.12.17.
Фармат 60×84 1/8. Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 14,42. Ул.-выд. арк. 16,57.
Тыраж 100 экз. Заказ 749.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца друкаваных выданняў
№ 1/236 ад 24.03.14.
Ліцэнзія № 02330/448 ад 18.12.13.
Вул. Савецкая, 18,
220030, Мінск.

*Адказны сакратар* В. П. Андрыевіч
*Рэдактар* В. П. Андрыевіч
*Камп'ютарная вёрстка* В. С. Яворскай

© Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 4.

✧ ✧ ✧

У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 02.02.2011 г. № 26 часопіс «Весці БДПУ. Серыя 2» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, культуралагічных, палітычных, сацыяльных, філасофскіх, эканамічных (эканамічная тэорыя) навуках

*Часопіс «Весці БДПУ. Серыя 2» у адпаведнасці з Пастановай ВАКа ад 08.06.2009 № 3 выходзіць:*
№ 1, 3 па навуковых кірунках «Паліталогія», «Сацыялогія», «Эканоміка»;
№ 2, 4 па навуковых кірунках «Гісторыя», «Філасофія», «Культуралогія».

✧ ✧ ✧ ✧ ✧ ✧

У адпаведнасці з дагаворам
паміж БДПУ і ТАА «Навуковая электронная бібліятэка» (ліцэнзійны дагавор № 676-12/2016 ад 21.12.2016 г.)
часопіс «Весці БДПУ» (у 3-х серыях) размяшчаецца на платформе eLIBRARY.RU і ўключаны ў Расійскі індэкс навуковага цытавання (РІНЦ) – бясплатны агульнадаступны інструмент вымярэння публікацыйнай актыўнасці вучоных і арганізацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 4. С. 6-14.

УДК 94(476)"18/19"

# РОЛЯ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ Ў ВЫРАШЭННІ ПРАБЛЕМЫ СЕРВІТУТУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)[1]

**С. А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 01.11.17.

UDC 94(476)"18/19"

# THE ROLE OF LOCAL GOVERNMENTAL AGENCIES IN SOLUTION OF THE PROBLEMS OF SERVITUDES IN THE TERRITORY OF BELARUS (THE SECOND HALF OF THE XIX / THE BEGINNING OF THE XX CENTURY)

**S. Tolmachyova,**
*Phd (History), Associate Professor of the Department of the History of Belarus and Slavic Peoples, BSPU*

Received on 01.11.17.

У артыкуле на падставе выкарыстання шырокага кола крыніц раскрыта роля мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання ў вырашэнні праблемы сервітуту на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Устаноўлена, што сервітутнае права стрымлівала развіццё капіталістычных адносін, выкарыстанне новых тэхналогій у аграрным сектары эканомікі, наносіла значную эканамічную шкоду памешчыцкай гаспадарцы. Адной з прычын такога становішча было недакладнае вызначэнне ў выкупных дакументах 60-х гг. XIX ст. плошчы і меж сервітутных угоддзяў міравымі пасрэднікамі і паверачнымі камісіямі. Маёнткавае дваранства імкнулася ліквідаваць сервітуты, але вырашэнне пытання мясцовымі ўстановамі часта стрымлівалася адмовай сялян. Шматлікія праекты і прапановы мясцовых органаў заканадаўчага вырашэння праблемы так і не былі рэалізаваны ўрадам.

*Ключавыя словы:* Беларусь, сервітут, аграрная рэформа, пазямельнае ўладкаванне сялян, сялянства, паместнае дваранства, мясцовае дзяржаўнае кіраванне, міравы пасрэднік, паверачныя камісіі, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці.

On the basis of using a wide range of sources, the article reveals the role of local governmental agencies in solution of the problems of servitudes in the territory of Belarus in the second half of the XIX / the beginning of the XX century. It ascertains that the servitude right was restraining the development of capitalist relations, using of new technologies in the agrarian sphere of economy and was causing significant damage to landowners' households. One of the reasons for this state was vague definition in the redemption documents of the 60s of the XIX century of the areas and boundaries of servitude lands by conciliators and verifying committees. The landlords were striving for the elimination of servitudes, but the solution of the problem by the local agencies was restrained by the rejection of peasants. Many projects and suggestions of the local agencies on the legal solution of the problem failed to be solved by the government.

*Keywords:* Belarus, servitudes, agrarian reform, land arrangement of peasants, local governance, conciliator, verifying committee, provincial offices on peasant affairs.

Сервітут – права сялян карыстацца ў маёнтках памешчыкаў асобнымі ўгоддзямі для пэўных гаспадарчых патрэб. Наяўнасць сервітутнага права з'яўлялася асаблівасцю пазямельных адносін на тэрыторыі Беларусі ў парэформенны перыяд. Практычна ўсе навукоўцы, якія ўсебакова даследавалі аграрную гісторыю краю, так ці інакш закранalі праблему сервітутаў. Пры гэтым дзейнасць органаў мясцовага кіравання па вырашэнні спрэчак паміж памешчыкамі і сялянамі пры ліквідацыі сервітутнага карыстання зямлёй не знайшла адпаведнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі.

На тэрыторыі Беларусі існавалі два віды сервітутаў: пашавыя (аднабаковыя і ўзаемныя) і лясныя. Пры аднабаковых правам

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання задання Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасьбы жывёлы карысталіся толькі сяляне на ўладальніцкіх угоддзях, а пры ўзаемным такое права належала абодвум бакам, кожнаму – на ўгоддзях другога. У адпаведнасці з родам угоддзяў, на якіх ажыццяўляўся выпас жывёлы, вызначаліся сервітуты для пасьбы на палях, лугах, у лясах, а таксама па зарасніках, багнах і іншых неапрацаваных угоддзях. Узаемнымі сервітутамі звычайна былі ворыўныя землі сялян і ўладальнікаў і толькі ў рэдкіх выпадках – лугі. Сервітутная пасьба на палях адбывалася ў той час, калі зямля была пад парам, а таксама да сяўбы і пасля збору хлеба; на лугах – увесну і пасля збору сена. На іншых угоддзях – у лясах, багнах, зарасніках і да т. п. пасьба па праве сервітуту дапушчалася на працягу ўсяго пашавага перыяду. Лясныя сервітуты былі толькі аднабаковыя і заключаліся ў праве сялян на атрыманне з уладальніцкіх лясоў будаўнічых матэрыялаў, дроў і валежніку, а таксама ў праве збірання грыбоў, ягад, арэхаў і інш. Сустракаліся і сервітуты па здабычы сялянамі каменю, пяску і гліны, збору чароту, лоўлі рыбы, ракаў і інш. на ўладальніцкіх землях [1, арк. 2–2 адв.].

У парэформенны перыяд падставай для карыстання сервітутамі служылі выкупныя дакументы, а ў некаторых выпадках дапаўняўшыя іх рашэнні па сялянскіх справах устаноў і судовых органаў, па скаргах бакоў на няправільныя замены ці пропускі сервітутнага права ў выкупных актах.

Права карыстання сервітутамі прадстаўлялася цэлым сельскім грамадам ці паселішчам, якія з'яўляліся юрыдычнай асобай у сервітутных адносінах. У некаторых маёнтках адным і тым жа ўгоддзем як сервітутным мелі права карыстацца некалькіх грамад, у іншых сяляне адной грамады карысталіся некалькімі падобнымі ўгоддзямі ў маёнтку. Выпадкі замацавання сервітутаў за пэўнымі асобамі адзначаліся толькі ў адносінах былых сельскіх вечных чыншавікоў, адзінаверцаў і стараабрадцаў [1, арк. 2 адв.].

Былыя ўладальніцкія сяляне заходніх губерняў атрымалі пазямельнае ўладкаванне на падставе Мясцовых палажэнняў 19 лютага 1861 г. для губерняў паўночна-заходніх (Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай і чатырох паветаў Віцебскай) і дзвюх беларускіх (Магілёўскай і астатніх паветаў Віцебскай) [2]. У адпаведнасці з гэтымі дакументамі сяляне паўночна-заходніх губерняў атрымалі ў надзел усе тыя сядзібныя і палявыя землі і ўгоддзі, якія былі ў іх карыстанні да 19 лютага 1861 г.

Істотным адрозненнем землеўладання ў краі з'яўлялася амаль паўсюдная цераспалоснасць сялянскіх угоддзяў з уладальніцкімі, якая была значна большай, чым у іншых губернях імперыі. Яна вызначалася, з аднаго боку, у перамяжэнні дробных сялянскіх палявых палос з такімі ж памешчыцкімі, а з другога – у раскіданых сярод уладальніцкіх лясоў дробных сялянскіх сенажацяў. У названых Мясцовых палажэннях быў вызначаны шасцігадовы тэрмін, на працягу якога памешчык меў права патрабаваць абавязковага для сялян адмежавання агульных і цераспалосных з сялянамі фальварковых угоддзяў, а таксама прадугледжваўся парадак размежавання. Але гэтыя правілы не набылі практычнага прымянення. Указамі 1 сакавіка, 30 ліпеня і 2 лістапада 1863 г. сяляне дзевяці заходніх губерняў былі пераведзены ў разрад сялян-уласнікаў, з пераўтварэннем устаўных грамат у выкупныя акты. Абавязковыя пазямельныя адносіны ліквідаваліся ў паўночна-заходніх губернях з 1 мая, паўднёва-заходніх – з 1 верасня 1863 г., а ў Магілёўскай і астатніх паветах Віцебскай губерні – з 1 студзеня 1864 г. [3]. 1 мая 1863 г. і 5 лютага 1864 г. Аляксандр II зацвердзіў палажэнні Галоўнага камітэта аб уладкаванні сельскага стану аб тым, што канчатковае аддзяленне сялянскіх угоддзяў ад памешчыцкай зямлі павінна адбывацца на дакладным выкананні арт. 112 Палажэння аб выкупе [4], г. зн. на падставе агульных законаў для дабрачыннага адмежавання земляў прыватных уладальнікаў, ці на падставе тых правілаў, якія будуць для гэтага выдадзены ўрадам. Таму ўсе артыкулы Мясцовых палажэнняў для губерняў паўночна- і паўднёва-заходніх, што тычыліся абавязковага размежавання ці абмену ўгоддзяў, згубілі сілу і значэнне. Дзеянне гэтых артыкулаў не было адноўлена і пазнейшымі заканадаўчымі актамі – правіламі 26 сакавіка 1869 г. [5] і законам 30 сакавіка 1892 г. [6]. У адпаведнасці з імі развярстанне ўгоддзяў у губернях Кіеўскай, Падольскай, Валынскай, Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай і частцы Віцебскай дапушчалася выключна на падставе дабрачынных пагадненняў. Між тым такія пагадненні мелі месца толькі ў вельмі рэдкіх выпадках.

Другой, яшчэ больш істотнай асаблівасцю пазямельнага ўладкавання сялян заходніх губерняў было прадстаўленне ім, разам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з надзяленнем зямлёю, права сервітутнага карыстання на памешчыцкіх угоддзях. Фактычна пачатак такога карыстання адносіцца да XV ст., але ўпершыню яно было адзначана ў гаспадарчых інвентарах, складзеных на падставе ўказа Мікалая I ад 1844 г. Аднак у Палажэннях 19 лютага 1861 г. пра яго нічога не было сказана. Таму ні памешчыкі, ні міравыя пасрэднікі, ні губернскія па сялянскіх справах прысутнасці не ўключалі сервітуты ва ўстаўныя граматы. У выніку пры складанні выкупных актаў узнік шэраг непаразуменняў як адносна сутнасці права сялян на пасьбу жывёлы на памешчыцкіх угоддзях, так і аб тым, ці трэба ўключаць гэтае права ў выкупныя акты.

Для вырашэння праблемы Віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў 15 лютага і 1 ліпеня 1864 г. выдаў асобыя распараджэнні, у якіх тлумачылася, што на падставе арт. 3 Мясцовага палажэння для паўночна-заходніх губерняў 1861 г. за сялянамі замацоўваліся пашавыя сервітуты на ўладальніцкіх угоддзях і што гэта неабходна зафіксаваць у выкупных актах [7, с. 102–105, 138–140]. Пазней распараджэнні М. М. Мураўёва атрымалі заканадаўчую санкцыю ў правілах 26 сакавіка 1869 г. аб адмежаванні сялянскіх надзелаў і заканчэнні паверачных работ у Паўночна-Заходнім краі [5].

У адпаведнасці з артыкуламі IV аддзела названых правілаў «право пастьбы не землях и в лесах помещиков (сервитут), будучи утверждено за крестьянами в силу статьи 3 Местного положения 19 февраля 1861 г. и статьи 1 указа 1 марта 1863 г., не может быть отменяемо иначе, как с соразмерным за оное вознаграждением крестьян…» [5]. Таму пашавы сервітут можна было ліквідаваць толькі ў выпадку дабрачыннага пагаднення паміж памешчыкам і сялянамі. Пры гэтым міравыя пасрэднікі павінны былі назіраць, каб не былі парушаны правы казны, якая разглядала ўсю сукупнасць земляў і ўгоддзяў, што знаходзіліся ў карыстанні сялян, у тым ліку і сервітуты, у якасці залогу своечасовага пагашэння выкупной пазыкі. Такім чынам, урад быў зацікаўлены ў ахове эканамічных інтарэсаў сялян. Пры гэтым да дваранства ўлада ставілася ў гэты час яшчэ вельмі насцярожана і не была зацікаўлена ў павышэнні яго дабрабыту. Таму ў пэўных выпадках гаспадарчыя інтарэсы сялян задавальняліся за кошт памешчыкаў.

На мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах ускладаўся абавязак замацаваць з унясеннем у выкупныя дакументы за сялянамі ўсё тое, чым яны карысталіся да адмены прыгону на землях і ў угоддзях памешчыкаў, у тым ліку і розныя віды пашавых сервітутаў. Аднак паверачныя камісіі, якія займаліся праверкай, удакладненнем і выпраўленнем устаўных грамат, не заўсёды дакладна вызначылі ў дакументах такія ўгоддзі [8, с. 4; 5]. Прычын такога становішча было некалькі.

Па-першае, паверачныя работы праводзіліся ў шэрагу выпадкаў у спешным рэжыме. Напрыклад, па сцвярджэнні Віленскага генерал-губернатара А. Л. Патапава, «в Гродненской губернии, в коей работы сии производились особенно поспешно и официально названы были оконченными в 1864 г., в настоящее время [у 1868 г. – *С. Т.*], хотя выданы крестьянам данныя по 2000 имениям, но отграничение их надела в натуре сделано только в 150 имениях». Прычынай А. Л. Патапаў назваў «несходства выкупных актов с действительным крестьянским владением» [9, арк. 38].

Па-другое, некаторыя камісіі былі недастаткова кампетэнтнымі ў вырашэнні такога пытання, таму што пераважная большасць членаў паверачных камісій была выклікана з унутраных губерняў Расійскай імперыі, дзе ўвогуле ніколі не існавала такога паняцця, як «сервітутнае права», што было адной з асаблівасцей аграрных адносін у Паўночна-Заходнім краі. Так, Віленскі генерал-губернатар А. Л. Патапаў у чэрвені 1868 г. у адозве да міністра ўнутраных спраў адзначаў: «При смене, во время вооруженнаго мятежа, всех прежних мировых посредников из местных дворян-помещиков, некогда и нельзя было быть разборчивым в сформировании новаго состава. Естественно, что личный состав поверочных комиссий и вообще мировых учреждений набран был весьма разнокалиберный и неподготовленный к делу. При таком составе, вместо назначения каждому точно ограниченнаго законом места и круга действий, сделано было им лишь общее воззвание к политической деятельности и к водворению русских начал, без всякого разумнаго указания им меры и согласования их действий. …При разнокалиберности и неподготовленности личного состава, при отсутствии инструкций, надзора и согласования свыше, произошли крайнее разнообразие и произвольность действий нисших исполнительных инстанций, ведение каждым дела по своей личной мерке, допускавшее в некоторых полный простор необду-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

манности и увлечений, в особенности при шаткости и эластичности заменивших закон административных правил местной власти» [9, арк. 3 адв. – 5].

Па-трэцяе, у шэрагу выпадкаў правы сялян на пасьбу жывёлы не былі вызначаны дакладна. Ні ў рашэннях устаноў па сялянскіх справах, ні ў выкупных дакументах не прыводзілася колькасць наяўнай сялянскай жывёлы ці колькасць галоў жывёлы, якую сяляне мелі права выпускаць на выпас, але па большасці маёнткаў не былі вызначаны межы тэрыторыі, на якую распаўсюджвалася сервітутнае права. Часцей указвалася, што сялянам прадстаўляецца права пасьбы жывёлы «по-старому», «по-прежнему» і да т. п. Так, па даных МУС, у Мінскай губерні такіх маёнткаў налічвалася звыш 90 % ад усёй колькасці маёнткаў [10, с. 19]. Пры гэтым па выкупных актах у Мінскай губерні сервітутнае права было замацавана за 59,2 % сялянскіх двароў. У Мінскім, Навагрудскім, Слуцкім і Ігуменскім паветах – ад 64,7 да 88,5 % двароў, у Барысаўскім – 15,7 %, а ў астатніх 4-х паветах – ад 49 да 58,5 % надзельных двароў [11, с. 24].

15 лютага і 1 ліпеня 1864 г. М. М. Мураўёў загадваў, каб у выкупных актах тлумачыліся «мясцовасці», на якія распаўсюджваліся сервітутныя правы. Гэты выраз паверачнымі камісіямі разумеўся ў шырокім дыяпазоне. Таму ў выкупных актах сервітутнае права вызначалася вельмі невыразна: «по лесам помещика», «по-прежнему в лесах владельца», «в одну сторону от деревни на столько-то верст», «в таких-то урочищах» і да т. п. Па законе 26 сакавіка 1869 г. пры размежаванні надзельных земляў мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах былі абавязаны дакладна вызначыць і ўказаць канкрэтна тую тэрыторыю, на якой быў зацверджаны за сялянамі пашавы сервітут. Аднак у большасці выпадкаў ні зацікаўленыя бакі, ні названыя ўстановы не скарысталі магчымасць удакладніць сервітутныя адносіны. З гэтай прычыны ў значнай колькасці выкупных дакументаў не былі паказаны ні дакладныя межы, ні колькасць дзесяцін сервітутных пашаў. Так, па звестках МУС, у Мінскай губерні з агульнай колькасці 1882 пашавых сервітутаў толькі па 135 (каля 7 %) у дакументах былі дакладна вызначаны плошча і межы сервітутных угоддзяў [10, с. 73, 74].

У некаторых выпадках права «пасьбы па лясах» прадстаўлялася сумесна сялянам некалькіх паселішчаў без вызначэння кожнаму з іх асобных пашаў. Такая нявызначанасць сервітутных адносін перш за ўсё адмоўна ўплывала на рацыянальнае вядзенне сельскай і лясной гаспадаркі ва ўладальніцкіх маёнтках. Па-першае, пры замацаванні за сялянамі права пасьбы жывёлы «па лясах і балотах» без вызначэння іх межаў уладальнік быў абмежаваны ў сваім праве ўласнасці ва ўсім маёнтку і нават у тых яго частках, дзе фактычна сяляне сваёй жывёлы ніколі не паслі і дзе, уласна кажучы, не было сервітуту. Да пачатку XX ст. уладальнік не мог ні пераўтварыць некаторыя лясныя ўчасткі ў іншы від угоддзяў, ні прадаць частку маёнтка сялянам пры пасрэдніцтве Сялянскага банка. Уладальнік павінен быў прадставіць пасведчанне з губернскай прысутнасці аб тым, што плануемая пад расчыстку ці для продажу плошча не «обременена сервитутом». У сваю чаргу, губернская прысутнасць пры ўказаных умовах не мела права выдаць такое пасведчанне. Па-другое, нявызначанасць сервітутнага права з'яўлялася адной з галоўных прычын абвастрэння адносін сялян з памешчыкамі з-за пастаяннага павелічэння патрэбнасці сялян у пашах. У сваю чаргу, землеўладальнік імкнуўся скараціць прастору сервітутаў і пашырыць плошчу культурных угоддзяў за кошт лясоў і багнаў. Па-трэцяе, у выпадку прадстаўлення сервітутных правоў на пашы для некалькіх вёсак гаспадар быў пазбаўлены магчымасці заключаць здзелкі аб ліквідацыі сервітутаў з асобнымі паселішчамі, таму што заключэнне такога пагаднення не пазбаўляла жыхароў астатніх вёсак права на ўсю плошчу сервітутнай прасторы [10, с. 74].

У пачатку XX ст. ужо немагчыма было ўстанавіць, на якой дакладна частцы памешчыцкай зямлі сяляне карысталіся пэўнымі сервітутамі ў час выхаду на выкуп. Пры такіх умовах узнікалі праблемы пры вызначэнні кампенсацыі сялянам пры ліквідацыі сервітутаў, як таго патрабаваў закон ад 26 сакавіка 1869 г. [10, с. 19]. Гэтым тлумачыцца, з аднаго боку, вялікая разнастайнасць прапанаваных у свой час мясцовымі ўстановамі спосабаў і ўмоў ліквідацыі сервітутаў, а з другога – тое, што, нягледзячы на шматгадовую распрацоўку пытання, яно так і не было канчаткова вырашана на заканадаўчым узроўні.

Так, вядомы грамадскі дзеяч і памешчык Мінскай губерні Э. А. Вайніловіч адзначаў, што на Палессі сяляне, якія карысталіся правам пасьбы на агромністай прасторы ўладальніцкіх лясоў і багнаў, утрымоўвалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з камерцыйнымі мэтамі значна большую колькасць жывёлы, чым былі ў стане пракарміць узімку сенам, што збіралі з адведзеных ім у надзел лугоў. З гэтай прычыны, па яго меркаванні, забяспечваць сялянам выпас усёй іх жывёлы за кошт памешчыка было б несправядліва [8, с. 4, 5]. Па-першае, сервітутныя пашы да 1861 г. былі неабходным дапаўненнем да сялянскіх угоддзяў і мелі істотнае значэнне для гаспадарчага дабрабыту сялянства. Па-другое, сервітутныя плошчы вызначаліся выключна для выпасу такой колькасці жывёлы, якую сяляне маглі ўтрымоўваць на зімовым корме, атрыманым з угоддзяў, прадстаўленых у іх карыстанне памешчыкам. Гэта азначае, што і ў выкупных актах, дзе былі зафіксаваны сервітуты, меўся на ўвазе менавіта такі аб'ём, якім карысталіся сяляне да адмены прыгону. Пазней з-за недакладнасці і непаўнаты запісаў у выкупных дакументах і адсутнасці ўказання ў іх колькасці галоў сялянскай жывёлы, якая выпасалася да 1861 г. на ўладальніцкіх угоддзях, сяляне фактычна значна пашырылі сваё права. У пачатку XX ст. на сервітутных прасторах яны пасвілі неабмежаваную колькасць не толькі сваёй жывёлы, але нярэдка і чужой [10, с. 49, 50]. Землеўладальнікі ж гублялі магчымасць прыбытку. Так, па звестках МУС, у пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі за выпас адной галавы жывёлы звычайна бралося ад 10 да 50 кап., вельмі рэдка да 1 руб., а ў маёнтках з сервітутамі за выпас плацілі толькі некаторыя вольныя арандатары і, галоўным чынам, яўрэі, якія жылі ў паселішчах і заўсёды мелі магчымасць пасвіць сваю жывёлу разам з сялянскай, а калі наймалі выпас у ўладальнікаў, то па самых нізкіх цэнах [10, с. 53]. З гэтай прычыны пры спробе памешчыка ліквідаваць сервітут сяляне рашуча выказваліся супраць, не жадаючы пазбавіцца дадатковага прыбытку.

Па даных, прыведзеных вядомым даследчыкам А. В. Палонскім, у канцы 80-х гг. XIX ст. з 7895 маёнткаў Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай і чатырох паветаў Віцебскай губерні сервітуты існавалі ў 2446, з іх да 1 студзеня 1890 г. у 438 маёнтках паміж памешчыкамі і сялянамі былі заключаны дабрачынныя пагадненні аб замене сервітутаў. Пры гэтым у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях з 1167 маёнткаў з пашавымі сервітутамі пагадненне аб іх замене адбылося ў 120 маёнтках» [12, с. 458]. Гэта складала толькі 10,3 % ад іх агульнай колькасці.

Дзеля палягчэння такіх здзелак 30 сакавіка 1892 г. быў выдадзены закон, у адпаведнасці з якім дабрачынныя пагадненні аб ліквідацыі пашавых сервітутаў дазвалялася заключаць па прыгаворах, зацверджаных большасцю дзвюх трэціх колькасці сялян, а не аднагалосна, як было раней [6]. Аднак гэтая мера не прывяла да чакаемых вынікаў. Дабрачынныя здзелкі заставаліся такімі ж рэдкімі, як і аб размежаванні ўгоддзяў.

Напрыканцы XIX ст. у Мінскай губерні, па даных МУС, з агульнай колькасці ўладальніцкіх маёнткаў (2335) «сервитутом обременены» 1036 (44 %), і толькі ў 87 маёнтках сервітуты былі ліквідаваны. У інфлянцкіх паветах Віцебскай з 395 маёнткаў сервітутныя адносіны існавалі ў 243 маёнтках, што складала 61 %, і ў 65 маёнтках былі скасаваны [13, арк. 152 адв.]. У Віленскай губерні з 5446 маёнткаў сервітуты захаваліся ў 2449 (44,9 %) [14, с. 41]. Такія лічбы даюць падставы не пагадзіцца са сцвярджэннем А. В. Палонскага, што «царские власти шли навстречу местным помещикам, которые со второй половины 60-х годов повсеместно стали добиваться полного уничтожения всех видов сервитутов» [12, с. 458].

Па даных Галоўнага ўпраўлення землеўладкавання і земляробства, у 1911 г. у губернях Паўночна-Заходняга краю (без даных па Магілёўскай губерні) сервітуты існавалі ў 29,7 % маёнткаў. Калі ж выключыць з падлікаў даныя па Ковенскай губерні, дзе была найменшая ўдзельная вага такіх уладанняў (12,5 %), то карціна становіцца яшчэ больш уражлівай – 34,2 % маёнткаў. Так, у Віленскай губерні сервітутамі карысталіся 1810 грамад у 608 маёнтках з 2088, у Гродзенскай – 729 грамад у 413 з 1432, у Мінскай – 1540 грамад у 969 з 2365, у Віцебскай – 142 грамады у 157 маёнтках з 393 [1, арк. 3 адв.].

Адмоўны ўплыў сервітутаў на сельскагаспадарчае развіццё праявіўся адразу пасля пераўтварэння ўстаўных грамат у выкупныя акты. Непазбежныя вынікі пашавых сервітутаў разумеў сам М. М. Мураўёў, па распараджэнні якога права пасьбы жывёлы было замацавана за сялянамі па выкупных дакументах. Акрамя гэтага, у адозве ад 19 жніўня 1864 г. кіеўскі генерал-губернатар М. М. Аненкаў адзначыў неабходнасць правядзення абавязковага размежавання дзеля ўладкавання ўзаемных пазямельных адносін сялян і памешчыкаў. Пазней неабход-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

насць абавязковага развярстання прызнаў і М. М. Мураўёў. З гэтага часу абодва пытанні распрацоўваліся мясцовымі ўладамі і вышэйшымі дзяржаўнымі ўстановамі. У прыватнасці, 13 лютага 1891 г. Аляксандр III зацвердзіў журнал Асобай нарады пад старшынством міністра ўнутраных спраў. Нарада прызнала непарыўную сувязь паміж ліквідацыяй сервітутаў і развярстаннем угоддзяў. Было адзначана, што абавязковую замену сервітутаў у заходніх губернях неабходна ажыццяўляць адначасова з дзяржаўным межаваннем земляў памешчыцкіх і сялянскіх, для чаго неабходна выданне асобных правілаў. Па меркаванні Асобай нарады, абавязковая адмена сервітутаў была адкладзена да выдання новага межавога статуту, якое чакалася ў хуткім часе [10, с. 3, 4]. Аднак яго заканадаўчае зацвярджэнне было адкладзена на няпэўны тэрмін. Між тым пашавыя сервітуты і цераспалоснасць угоддзяў з'яўляліся крыніцай пастаянных аграрных непаразуменняў і спрэчак паміж сялянамі і памешчыкамі і абвастралі іх узаемаадносіны. Адначасова сервітуты стрымлівалі інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці і лясной гаспадаркі.

У канцы XIX ст. Сенат тлумачыў, што калі ў Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і частцы Віцебскай губернях пры адмежаванні сялянскага надзелу ў выкупных дакументах не ўказаны ці не апісаны межы пашавага сервітуту, як таго патрабавалі правілы 26 сакавіка 1869 г., то такое «упущение» павінна было быць выпраўлена сялянскімі ўстановамі і пасля зацвярджэння губернскай прысутнасцю дакументаў па адмежаванні (указ 29 лістапада 1899 г., № 6118) [10, с. 75]. Такім чынам, у названых губернях справы аб усталяванні закладных межаў і прасторы пашавых сервітутаў разглядаліся ў мясцовых установах па сялянскіх справах. Тым не менш для бакоў прадстаўлялася і магчымасць звяртацца з патрабаваннямі аб усталяванні плошчы і межаў пашавых сервітутаў у судовыя ўстановы. Аднак судовы працэс быў вельмі складаны з-за шматлікіх фармальнасцей і звычайна звязаны са значнымі выдаткамі, непасільнымі не толькі для сялян, але і для памешчыкаў. Таму судовыя працэсы аб межах і плошчы сервітутных пашаў узнікалі параўнальна рэдка.

Па меркаванні МУС, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці маглі вызначыць памер кампенсацыі сялянам пры ліквідацыі сервітутаў толькі ў тым выпадку, калі быў праведзены кадастр зямель. Аднак яго проста не існавала. Гэтак жа не маглі прымяняцца і існаваўшыя ў заходніх губернях ацэнкі зямель для спагнання дзяржаўнага падатку і земскіх збораў па прычыне таго, што яны складаліся па розных сістэмах не толькі ў кожнай губерні, але нават і ў асобных паветах. З-за гэтага ў адных паветах колькасць разрадаў угоддзяў даходзіла да 65 (Гродзенскі), а ў іншых абмяжоўвалася 3 (Віцебская губерня). Ацэнка лясных угоддзяў праводзілася не па якасці глебы, а па кошце леса, які там рос. Увогуле названыя ацэнкі, як вызначаныя для іншых мэтаў, не выражалі ні сапраўднага кошту розных відаў зямельных угоддзяў, ні правільных суадносін паміж імі па якасці і вытворчасці глебы [10, с. 55, 56].

Па водзывах мясцовых устаноў па сялянскіх справах і службовых асоб, умовы дабрачынных здзелак аб ліквідацыі сервітутаў былі вельмі разнастайныя. Да таго ж спецыяльныя пашы, якія ўвайшлі ў склад сялянскага надзелу, у многіх выпадках да пачатку XX ст. згубілі сваё прамое прызначэнне і былі пераўтвораны ў ворыва ці сенажаць [10, с. 58]. Гэта зразумела, таму што такія землі прыносілі больш прыбытку, чым пашы.

Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць прызнала дастатковым адвесці для сялян, замест пашавага сервітуту, плошчу пашы, роўную 1/6 адведзенай ім у надзел ворнай зямлі. Пры гэтым сялянская і памешчыцкая жывёла забяспечвалася б пашай на аднолькавых падставах. Азначаны разлік у галоўных яго падставах прызнаны быў з сельскагаспадарчага пункту гледжання правільным [8, с. 8, 9].

25 студзеня 1899 г. віцэ-старшыня Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі Э. А. Вайніловіч склаў запіску па пытанні аб ліквідацыі сервітутаў. У ёй прапанавалася разлічваць прырэзку ў дачыненні не да адных толькі ворыўных зямель, а да ўсёй зручнай, што складала сялянскі зямельны надзел. На думку Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, гэта было справядліва, калі прыняць ва ўвагу пасьбу жывёлы не толькі на 2/3 чацвёртага поля, але і на лугах. Такім чынам, і па гэтым разліку пастаянныя суадносіны паміж пашай і астатнімі ўгоддзямі ўсталёўваліся як 1 да 6, ці, іншымі словамі, у кожнай гаспадарцы паша павінна была складаць 15 % усіх зручных угоддзяў [8, с. 8–12].

Пры вырашэнні пытання аб сервітутах узнікалі і пытанні іншага характару. Акрамя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

розных відаў пашавага сервітуту, сялянам у некаторых выпадках былі прадстаўлены па выкупных дакументах таксама агульныя з памешчыкам выганы і пашы. Паміж правам сялян на карыстанне «обремененными пастбищными сервитутами пространствами», з аднаго боку, і агульнымі пашамі і выганамі – з другога, існавала карэннае адрозненне. У прыватнасці, на сервітутных прасторах сялянам прадстаўлялася толькі права выпасу жывёлы, права ж уласнасці на гэтыя прасторы поўнасцю належала ўладальніку. Агульныя ж выганы і пашы з'яўляліся, адпаведна, агульнай уласнасцю памешчыка і сялян. Аднак вельмі важны для вызначэння правоў бакоў тэрмін «общее пастбище», на жаль, не заўсёды выкарыстоўваўся ў выкупных дакументах з неабходнай у такіх выпадках дакладнасцю. Заканадаўча не была ўсталявана розніца паміж агульнымі пашамі і сервітутным карыстаннем. З гэтай прычыны зусім розныя па сутнасці паняцці «общее» ці «общее с помещиком пастбище», з аднаго боку, і «общая пастьба крестьян с помещиком» ці «право общей пастьбы с помещиком в лесу» – з другога, у выкупных дакументах часта атаясамліваліся і не заўсёды выражалі тыя правы, якія на самой справе былі прадстаўлены сялянам. У выніку былі выпадкі, калі агульныя пашы памешчыка і сялян па тэрміналогіі выкупных дакументаў былі аднесены да разраду «обремененного пастбищным сервитутом пространства» і, наадварот – плошчы пад сервітутамі названы агульнымі пашамі. Наяўнасць такіх памылак у выкупных дакументах адзначалася ў адозвах мясцовых службовых асоб і ўстаноў па сялянскіх справах [10, с. 82, 83]. У сваю чаргу, падобныя недакладнасці прыводзілі да канфліктаў паміж бакамі. Такім чынам, нявызначанасць юрыдычных паняццяў, з аднаго боку, і недастатковая кампетэнтнасць асабовага складу ўстаноў па сялянскіх справах у 60-я гг. XIX ст. стала прычынай узнікнення складаных зямельных спрэчак паміж сялянамі і памешчыкамі ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Трэба адзначыць, што існаванне сервітутаў мела не толькі эканамічныя, але і палітычныя наступствы. Так, у канцы XIX ст. Міністэрства ўнутраных спраў адзначала, што «неуважение к чужой собственности, в особенности же к собственности помещиков, всего более замечается именно в губерниях западного края». У МУС лічылі, што існаванне сервітутаў не ішло на карысць землеўладальнікам «польскага» паходжання, якіх у краі была пераважная большасць. «…Естественно, поэтому, что интересы местнаго, в большинстве русскаго, православного крестьянского населения имели преобладающее значение в глазах правительственной власти. Но переходившее… нередко за пределы справедливости покровительственное отношение органов местной администрации к крестьянам, содействуя, быть может, ослаблению в крае польского землевладельческого элемента, не могло не возыметь, в известной степени, и развращающаго влияния на сельское население западных губерний, приучая его к мысли о возможности безнаказанно нарушать права частных землевладельцев, что, в свою очередь, в настоящее время неблагоприятно отражается на условиях жизни и хозяйства поселившихся в крае русских помещиков» [13, арк. 153–153 адв.].

Міністэрства ўнутраных спраў прызнала неабходным прыступіць да вырашэння пытання аб абавязковай ліквідацыі пашавых сервітутаў і развярстанні ўгоддзяў, не чакаючы дзяржаўнага межавання ў Заходнім краі. З гэтай мэтай у 1899 г. быў складзены праект адпаведных правілаў і разасланы на заключэнне мясцовых устаноў і службовых асоб. На падставе атрыманых ад іх звестак праект зноў быў перапрацаваны і адпраўлены на абмеркаванне створанай у 1903 г. міжведамаснай нарады з удзелам мясцовых службовых асоб і грамадскіх дзеячаў.

Нарадай быў выпрацаваны праект «Правил о разверстании крестьянских надельных и владельческих чересполосных угодий, упразднении пастбищных и лесных сервитутов и разделе общих выгонов, пастбищ, водопоев в губерниях Виленской, Ковенской, Гродненской, Киевской, Подольской, Волынской и Минской и в Инфляндских уездах Витебской губернии». Аднак у сувязі са зменамі ва ўнутранай палітыцы праект не атрымаў далейшага развіцця да 1909 г., калі пры МУС была створана новая Міжведамасная нарада па пытанні аб ліквідацыі сервітутных адносін у Заходнім краі. Нарадай 1909 г. праект аб адмене сервітутаў быў значна перапрацаваны, а затым прадстаўлены на абмеркаванне ў Дзяржаўную думу, але не зацверджаны [10, с. 4, 5]. Аднак і ў 1913 г. чарговы праект «Правил», адобраны ў Савеце міністраў, так і не набыў сілу закону. Рэалізацыя сталыпінскай аграрнай рэформы прадугледжвала развярстанне зямель,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 38. – 1863. – № 39337; №39928; № 40172.
4. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 36. 1861 – № 36659.
5. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 44. – 1869. – № 46901.
6. ПСЗРИ. – Собр. 3-е. – Т. 12. – 1892. – № 8473.
7. Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян-собственников в Северо-Западном крае. – Вильна : тип. Штаба Вилен. воен. окр., 1864. – [2], VI, 150 с.
8. *Войниллович, Э. А.* Об упразднении пастбищных сервитутов и уничтожении черезполосности крестьянских земель с фольварковыми в западных губерниях : Записка Э. А. Войнилловича [вице-пред. Мин. о-ва сел. хоз[-ва]] / Э. А. Войниллович. – Минск : типо-лит. Тасьмана и Сыновей, 1899. – 13 с.
9. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 33, 1868 г. Спр. 34.
10. Краткая история вопроса о сервитутах и общие соображения о ликвидации сервитутных отношений. II. О вознаграждении за отмену толоки и обоюдного права пастьбы на полях общего севооборота [и др.]. Правила об упразднении пастбищных и лесных сервитутов в губерниях западных и белорусских : Проект. – [СПб.] : тип. М. Волковича, [1910]. – 122 с.
11. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности : в 58 т. – СПб. : Тип. Т-ва «Нар. польза», 1903–1904. – Т. 21 : Минская губерния. – 1903. – VIII, 435 с.
12. *Полонский, А. В.* Отношение царского правительства к вопросу о пастбищных сервитутах в Белоруссии / А. В. Полонский // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы (1961). – 1963. – С. 458–459.
13. РДГА. – Ф. 1149. Воп. 13, 1900 г. Спр. 82.
14. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности : в 58 т. – СПб. : Тип. Т-ва «Нар. польза», 1903–1904. – Т. 4 : Виленская губерния. – 1903. – IV, 212 с.
15. Обзор деятельности уездных землеустроительных комиссий за первый год их существования (по 1 октября 1907 года) / Гл. упр. землеустройства и земледелия, Департамент гос. земел. имуществ. – СПб. : Гос. тип., 1908. – [4], XII, 61 с.

3. PSZRI. – Sobr. 2-e. – T. 38. – 1863. – № 39337; №39928; № 40172.
4. PSZRI. – Sobr. 2-e. – T. 36. 1861 – № 36659.
5. PSZRI. – Sobr. 2-e. – T. 44. – 1869. – № 46901.
6. PSZRI. – Sobr. 3-e. – T. 12. – 1892. – № 8473.
7. Sbornik pravitel'stvennyh rasporjazhenij po ustrojstvu byta krest'jan-sobstvennikov v Severo-Zapadnom krae. – Vil'na : tip. Shtaba Vilen. voen. okr., 1864. – [2], VI, 150 s.
8. *Vojnillovich, Je. A.* Ob uprazdnenii pastbishhnyh servitutov i unichtozhenii cherezpolosnosti krest'janskih zemel' s fol'varkovymi v zapadnyh gubernijah : Zapiska Je. A. Vojnillovicha [vice-pred. Min. o-va sel. hoz[-va]] / Je. A.Vojnillovich. – Minsk : tipo-lit. Tas'mana i Synovej, 1899. – 13 s.
9. RDGA. – F. 1291. Vop. 33, 1868 g. Spr. 34.
10. Kratkaja istorija voprosa o servitutah i obshhie soobrazhenija o likvidacii servitutnyh otnoshenij. II. O voznagrazhdenii za otmenu toloki i obojudnogo prava past'by na poljah obshhego sevooborota [i dr.]. Pravila ob uprazdnenii pastbishhnyh i lesnyh servitutov v gubernijah zapadnyh i belorusskih : Proekt. – [SPb.] : tip. M. Volkovicha, [1910]. – 122 s.
11. Trudy mestnyh komitetov o nuzhdah sel'skohozjajstvennoj promyshlennosti : v 58 t. – SPb. : Tip. T-va «Nar. pol'za», 1903–1904. – T. 21 : Minskaja gubernija. – 1903. – VIII, 435 s.
12. *Polonskij, A. V.* Otnoshenie carskogo pravitel'stva k voprosu o pastbishhnyh servitutah v Belorussii / A. V. Polonskij // Ezhegodnik po agrarnoj istorii Vostochnoj Evropy (1961). – 1963. – S. 458–459.
13. RDGA. – F. 1149. Vop. 13, 1900 g. Spr. 82.
14. Trudy mestnyh komitetov o nuzhdah sel'skohozjajstvennoj promyshlennosti : v 58 t. – SPb. : Tip. T-va «Nar. pol'za», 1903–1904. – T. 4 : Vilenskaja gubernija. – 1903. – IV, 212 s.
15. Obzor dejatel'nosti uezdnyh zemleustroitel'nyh komissij za pervyj god ih sushhestvovanija (po 1 oktjabrja 1907 goda) / Gl. upr. zemleustrojstva i zemledelija, Departament gos. zemel. imushhestv. – SPb. : Gos. tip., 1908. – [4], XII, 61 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ